# ГАЗЕТА «ЗВЯЗДА»: ПАЧАТАК БЕЛАРУСКАМОЎНАГА ПЕРЫЯДУ ВЫДАВЕЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***В. І. Канюта***

*Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом “Звязда”»,*
*вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*veronika_kanyuta@mail.ru*

Аналізуецца нумар газеты «Звязда» за 9 жніўня 1927 года, прымеркаваны да дзесяцігоддзя выхаду друкаванага сродку масавай інфармацыі. У гэты дзень выданне поўнасцю перайшло на беларускую мову, на якой выходзіць да цяперашняга часу. Публікацыі спецыяльнага выпуску сведчаць аб тым, што за дзесяцігадовы перыяд існавання «Звязда» стала аўтарытэтным органам, папулярнай крыніцай інфармацыі. Многія матэрыялы першага беларускамоўнага нумара газеты прысвечаны адметным фактам з гісторыі стварэння «Звязды», якія могуць быць карыснымі для даследчыкаў гісторыі нацыянальнага перыядычнага друку.

***Ключавыя словы:*** журналістыка; сродкі масавай інфармацыі; перыядычны друк; газета «Звязда»; беларуская мова.

# NEWSPAPER «ZVIAZDA»: THE BEGINNING OF THE BELARUSIAN-LANGUAGE PERIOD OF PUBLISHING

***V. I. Kanyuta***

*Publishing institution «Publishing house “Zvyazda”»,*
*10-a, B. Khmelnitskogo Str., 220013, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. I. Kanyuta (veronika_kanyuta@mail.ru)*

The issue of the newspaper «Zviazda» for August 9, 1927 is analyzed. It is dedicated to the tenth anniversary of the publication of the printed media. On this day the newspaper completely switched to the Belarusian language, in which it has been published to this day. Publications of special issue testify to the fact that over the ten years of its existence, «Zvyazda» has become an authoritative edition, a publicly available source of information. Many articles of first Belarusian-language issue of newspaper are devoted to remarkable facts from history of the

Zviazda's creation. They may be useful to researchers of history of national periodicals.

***Key words:*** journalism; mass media; periodicals; newspaper «Zvyazda»; Belarusian language.

Рэспубліканская грамадска-палітычная газета «Звязда» – адно з нямногіх штодзённых перыядычных выданняў краіны, якое на працягу 95 гадоў выходзіць на беларускай мове. Газета з'яўляецца адзіным нацыянальным сродкам масавай інфармацыі, кантэнт якога падаецца толькі па-беларуску. Слоган перыядычнага выдання – родная газета на роднай мове – абумоўлены шматгадовай традыцыяй, якая вылучае «Звязду» сярод іншых медыя Рэспублікі Беларусь.

Газета стваралася як рускамоўная, першы нумар выйшаў 9 жніўня 1917 года пад назвай – «Звезда». У 1925 годзе публікацыі ў «Звяздзе» пачалі друкавацца не толькі па-руску, а і па-беларуску. Поўнасцю беларускамоўнай газета павінна была стаць 1 студзеня 1927 года. Аднак, як паведамлялася ў рэзалюцыі пленума ЦК КП(б)Б па пытанні аб пашырэнні межаў БССР, «у сувязі з далучэннем Гомельшчыны, дзе беларусізацыя павінна прайсці яшчэ першую стадыю, лічыць немэтазгодным пераход «Звязды» цалкам на беларускую мову з 1 студзеня 1927 года, паколькі гэты пераход аслабіў бы кіруючую сувязь Мінска ў дачыненні Гомельшчыны праз мацнейшую прыладу кіраўніцтва – газету ЦК КПБ» [1, с. 36].

У выніку цалкам на беларускую мову выданне перайшло 9 жніўня 1927 года, калі адзначалася дзесяцігоддзе з дня выхаду першага нумара газеты. З гэтай нагоды рэдакцыйным калектывам быў падрыхтаваны спецыяльны выпуск. Першы беларускамоўны нумар «Звязды» захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь. Ён адметна адрозніваецца ад астатніх, якія разам з ім складаюць падшыўку газеты за другое паўгоддзе 1927 года. Па-першае, нумар ад 9 жніўня вылучаецца аб'ёмам: замест традыцыйных для таго часу чатырох палос фармату А2 спецвыпуск утрымлівае шэсць палос такога ж фармату. Па-другое, юбілейны, у гонар дзесяцігоддзя існавання газеты, нумар вызначаецца багатым зместавым напаўненнем і арыгінальным для таго часу афармленнем.

Выпуск «Звязды» за 9 жніўня 1927 года выйшаў у аўторак, пад нумарам 179 (2689 – з моманту выхаду газеты). На першай паласе была перадрукавана паменшаная копія першага нумара «Звязды». На сёння гэта адзінае сведчанне таго, якім быў той нумар. Рыхтуючы артыкул, удалося высветліць, што арыгінал першага выпуску газеты не захаваўся. Перадрукаваўшы яго ў спецвыпуску з нагоды дзесяцігоддзя выдання,

калектыў збярог гэты ўнікальны нумар для гісторыі. «Сёння «Зьвязда» пачынае 11-ты год свайго існавання», – звяртае ўвагу выданне, якое ў жніўні 1927 года з'яўляецца органам Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі і Мінскага акругкама КП(б)Б. Назва газеты – «Зьвязда», у адпаведнасці з тагачаснымі правіламі арфаграфіі.

Канцэптуальна-тэматычны змест нумара фарміруюць публікацыі аб ролі і значнасці «Звязды» ў грамадстве, віншаванні калектыву газеты. Прывітанні, у тым ліку на арабскай мове, у адрас рэдакцыі прагучалі ад Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, Мінскага акругкама КП(б)Б, старшыні ЦВК Беларускай ССР Аляксандра Чарвякова, калег з іншых выданняў, якія выходзілі ў Савецкім Саюзе, рабочых і служачых друкарні «Зьвязда». Вядомыя пісьменнікі прысвяцілі выданню вершы, якія апублікаваны ў спецыяльным выпуску: П. Глебка «Дзяньніца», А. Александровіч «На шляху…», М. Багунец «“Зьвяздзе” ў дзесятыя ўгодкі яе існаваньня».

Нямала матэрыялаў гэтага нумара прысвечана гісторыі стварэння газеты. Змяшчаецца фотаздымак друкарні, дзе выдаваліся першыя нумары «Звязды», публікуюцца партрэты яе першых рэдактараў: А. Мяснікова, М. Фрунзе, В. Фаміна, В. Кнорына. Расказваецца аб месцах выхаду «Звязды» ў першае дзесяцігоддзе існавання. Друкуюцца першыя палосы некаторых нумароў газеты, калі яна выходзіла пад назвамі «Молот» і «Буревестник». Гэтыя выданні таксама не захаваліся, таму каштоўнасць нумара «Звязды» за 9 жніўня 1927 года яшчэ і ў тым, што можна атрымаць уяўленне, як выглядала газета, калі выходзіла пад іншымі назвамі.

У спецвыпуску падводзяцца вынікі выдавецкай дзейнасці «Звязды» за дзесяцігадовы перыяд. Гэта быў няпросты час – неаднаразова рэдакцыя знаходзілася пад пагрозай закрыцця. Каб захаваць газету, калектыў вымушаны быў наладжваць выдавецкую дзейнасць у іншых гарадах, у мэтах канспірацыі газета тройчы мяняла назву: са «Звязды» на «Молот» (падрыхтавана 18 выпускаў), з «Молота» на «Буревестник» (выпушчана 19 нумароў), з «Буревестника» – зноў на «Звязду».

З годнасцю выканаўшы сваю місію як друкаванага органа ў час Кастрычніцкай рэвалюцыі, «Звязда» ўзмацніла свой аўтарытэт і стала найбольш уплывовым выданнем тагачаснай Беларусі. Затым краіну, а адпаведна і газету, чакалі новыя выпрабаванні: Грамадзянская вайна, выхад з разрухі, гаспадарчае будаўніцтва, адраджэнне нацыянальнай культуры і адукацыі. Аб тым, што за дзесяцігадовую гісторыю свайго існавання выпала на лёс газеты, сведчыў карэспандэнт А. Крыніцкі (цытуем з захаваннем тагачаснага правапісу): «“Зьвязда” на працягу 10 год арганізоўвала вакол лёзунгаў партыі і давала асвету масам рабочых

і сялян і працоўных гораду, мястэчка і вёскі ўсіх нацыянальнасцяй. “Зьвязда” клікала на бойку, “Зьвязда” біла па адступленьнях ад ленінскай лініі, “Зьвязда” паказвала посьпехі будаўніцтва, “Зьвязда” была магутнай зброяй ЦК КП(б)Б у справе кіраўніцтва будаўніцтвам ва ўсіх галінах, “Зьвязда” выкрывала памылкі і злачынствы, бязьлітасна сьцябала бюракратаў, ганарлівых камуністых, адміністратараў, людзей якія адарваліся ад мас пралетарыяту, “хвасьцістаў”. Вось чаму бальшавік зьвязаны з БССР ня можа не адзначаць юбілею “Зьвязды” з любоўю…» (Звязда. 1927. 9 жніўня).

Дзесяцігадовы выхад «Звязды», які суправаджаўся шматлікімі ваенна-палітычнымі ўзрушэннямі ў краіне і грамадстве, у выніку чаго газета вымушана змяніла і назву, і месца выхаду, – нагода не толькі падвесці высновы выдавецкай дзейнасці ў няпросты перыяд, а і вызначыць прыярытэтныя кірункі развіцця на будучыню. Асноўныя задачы «Звязды» на бліжэйшыя гады сфармуляваў адзін з яе першых рэдактараў В. Кнорын (цытуем з захаваннем тагачаснага правапісу): «Важнейшай задачай бальшавіцкага органу друку было, ёсьць і будзе – бязьлітасная барацьба з дробна-буржуазнымі перажыткамі і настроямі, з апартуанізмам і з усялякімі ідэалёгічнымі выкрыўленьнямі і адступленьнямі ад ленінізму. <…>. Нам абавязкова трэба падняць з партыйных мас новы шырокі пласт кіруючых працаўнікоў партыі, саветаў, прафсаюзаў і грамадзкіх арганізацый. Нам абавязкова трэба стварыць рэзэрвы кіраўнічыў працаўнікоў. <…>. Трэцяя задача «Звязды», якую яна выконвае ад першага нумару, – мабілізацыя шырокіх мас вакол нашае партыі пад яе палітычнае кіраўніцтва <…>. Арганізацыя абароны і падрыхтоўка мас да абароны ёсьць задача з задач бягучага моманту. На вырашэньне яе павінны быць накіраваны ўсе нашы сілы» (Звязда. 1927. 9 жніўня). Пераход газеты на беларускую мову В. Кнорын называе вырашэннем нацыянальнага пытання. У сувязі з гэтым, па яго словах, Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі ахопіць больш шырокія масы рабочых і сялян, якія ў асноўным размаўляюць па-беларуску.

Аднак не толькі звязаныя з юбілеем газеты тэмы закранаюцца ў спецыяльным выпуску «Звязды», прымеркаванага да яе дзесяцігоддзя. Не застаюцца па-за ўвагай аўтараў гэтага гістарычнага нумара і актуальныя для таго часу падзеі. У прыватнасці, артыкулы прысвечаны дасягненням і недахопам у партыйным кіраўніцтве сельскімі Саветамі, падрыхтоўцы да восеньскай пасяўной кампаніі, праблемам лясной гаспадаркі, працы папраўчых калоній. Цыкл заметак закранае тэму абароны СССР. Друкуюцца нататкі падарожніка, у якіх распавядаецца пра ахову здароўя ў Францыі. Шэраг заметак прысвечаны навінам з-за мяжы.

Апошняя – шостая паласа – поўнасцю занятая аб’явамі, анонсамі кінапаказаў і паведамленнямі. Друкуюцца параўнальныя табліцы коштаў на вырабы швейнай фабрыкі, лекавыя сродкі. У выпуску пазначана, што часова выконвае абавязкі галоўнага рэдактара на той момант М. Шульман. Як удалося высветліць аўтару артыкула, лёс Маісея Якаўлевіча Шульмана да канца не вызначаны. Ёсць падставы меркаваць, што, як і многія рэдактары «Звязды» 1930-х гадоў, ён трапіў пад рэпрэсіі. М. Шульман з’яўляўся ўраджэнцам Магілёўскай губерні, скончыў фізіка-матэматычны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. Працуючы выкладчыкам, прымаў удзел у аднаўленні народнай адукацыі ў Беларусі. З красавіка 1924 г. па студзень 1926 г. – намеснік загадчыка аддзела друку ЦК КП(б)Б. Працоўны шлях у «Звяздзе» пачаў у лютым 1926 года, заняўшы пасаду намесніка рэдактара газеты. З мая па жнівень 1927 года выконваў абавязкі рэдактара «Звязды». Такім чынам, святочны выпуск ад 9 жніўня 1927 года – адзін з апошніх, на якім пазначалася яго імя. Затым М. Шульман перайшоў у рэдакцыю газеты «Рабочий» (з 1937 г. – «Советская Белоруссия», з 2018 г. – «СБ. Беларусь сегодня») [2, с. 69], дзе адпрацаваў усяго восем месяцаў. У сакавіку 1928 г. быў прызначаны рэдактарам ТАСС, затым рэдагаваў газету «Тверская правда», выдавецтва Маскоўскага аблвыканкама, Маскоўскае аддзяленне Усесаюзнага трэста «Саюзфота». Апошняе месца работы М. Шульмана, аб якім вядома, – Інстытут нацыянальнасцяў СССР (Масква). Далейшы лёс чалавека, імя якога пазначана ў святочным выпуску «Звязды» за 9 жніўня 1927 г., невядомы.

Афармленне гэтага гістарычнага нумара простае, сціплы ў адпаведнасці з магчымасцямі таго часу ілюстрацыйны матэрыял. Аднак з пункту гледжання зместу выпуск разнастайны: як жанрава, так і тэматычна. Актуальна сёння гучыць вытрымка з публікацыі А. Сянкевіча (цытуецца з захаваннем стылістычных асаблівасцяў): «Прэса, друкаванае слова зьяўляецца двухбакова-вострай зброяй. У руках капіталістычных, у руках клерыкалізму яна шырыць цемру, затушоўвае клясавую сьвядомасьць, арганізуе думку людзей у бок падтрыманьня існуючага ладу эксплёатацыі і ўціску. У руках пралетарыяту прэса таксама зьяўляецца магутным аружжам – ня толькі сродкам прапаганды і агітацыі, сродкам клясавага ўсьвядамленьня мас; прэса ў руках партыі, у руках рабочае клясы – ёсьць магутны арганізуючы сродак як сацыялістычнага будаўніцтва, так і разьвіцьця калектыўных форм жыцьця» (Звязда. 1927. 9 жніўня).

Такім чынам, нумар ад 9 жніўня 1927 года з’яўляецца знакавым у гісторыі найстарэйшага рэспубліканскага выдання. Ён унікальны не толькі тым, што з’яўляецца першым беларускамоўным. Гэта адзіны нумар, які

з'яўляецца дакументальным сведчаннем таго, як выглядалі першы выпуск «Звязды», а таксама выданні «Молот» і «Буревестник» – пад гэтымі назвамі ў 1917 годзе часова выходзіла газета. Многія публікацыі гэтага выпуску адзначаны адметнымі фактамі з гісторыі стварэння «Звязды», якія могуць быць карыснымі для даследчыкаў гісторыі нацыянальнага перыядычнага друку. Частковае перавыданне гэтага выпуску дзякуючы сучасным тэхналогіям «Звязда» ажыццявіла 9 жніўня 2022 года, калі газета адзначала 105 гадоў.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. «Звязда»: гісторыя газеты – гісторыя краіны: (падарожжа праз стагоддзе) / уклад. Алена Ляўковіч; аўт. тэксту: А. Дзядзюля, В. Канюта, В. Целяшук; пад агульн. рэд. П. Я. Сухарукава. Мінск: Звязда, 2017. 200 с.
2. *Селеменев В*. Редакторы газеты «Советская Белоруссия» в 1927–1941 гг. // Матэрыялы Рэспублік. навук.-практ. канф., прысвечанай 90-годдзю газеты «Звязда» і 80-годдзю газеты «Советская Белоруссия» / рэдкал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) і інш. Мінск, 2007. 91 с.